Захапляльныя гісторыі летняга адпачынку

Аўтар: кс. Юры Жэгарын
09.09.2018 00:00



У канцы ліпеня рэдакцыя “Слова Жыцця” аб’явіла конкурс на цікавы аповед пра свае канікулы з Богам. Сёння на старонках выдання падводзім яго вынікі. Увазе чытачоў прапануюцца працы, якія будуць адзначаны прызамі. Незвычайнае падарожжа па Нёмане У ліпені моладзь з парафіі св. Міхала Арханёла ў Навагрудку (але не толькі) адправілася ў незвычайнае падарожжа на байдарках па рацэ Нёман з Любчы да маста, які знаходзіцца непадалёк Іўя. Напачатку адбыўся інструктаж бяспечных паводзін на вадзе і супольная малітва.

Сама выправа заняла каля 8-мі гадзін. Удзельнікі падарожжа ў складзе 9-ці чалавек пераадолелі разам каля 40-ка кіламетраў. Усё для гэтага склалася найлепшым чынам: добрае надвор’е, свабодныя байдаркі і магчымасць іх транспартавання да месца адпраўлення і прыбыцця. † “Для мяне асабіста гэта быў незабыўны досвед. Уразіла фантастычная, багатая прырода нашай краіны, а таксама пачуццё гармоніі з прыродай. Такія выправы, мне здаецца, яднаюць людзей. Гэта вельмі класна”.



“Я плаваў на байдарцы першы раз у жыцці! Ды яшчэ на такую вялікую дыстанцыю… Быў у захапленні ад нашай каманды і атмасферы, якая панавала падчас падарожжа па Нёмане”.

Захапляльныя гісторыі летняга адпачынку

Аўтар: кс. Юры Жэгарын
09.09.2018 00:00





